**Н. А. Каліноўская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі

## Заданні творчага характару

**У. Караткевіч «Нямоглы бацька» (5 клас).** Калі б вы былі нямоглым бацькам, што сказалі б, параілі свайму сыну (дачцэ)?

Намаляваць эмблему «Сям'я».

**К. Чорны «Насцечка» (6 клас).** Намаляваць вокладку для кнігі, прадумаць ілюстрацыі, скласці сінквейн па тэме «Дружба». Творчыя заданні па распрацоўцы дыдактычнага матэрыялу (крыжаванкі, тэставыя заданні).

**М. Лупсякоў «Мэры Кэт» (7 клас).** Успомніце вобразы навічкоў з твораў, прачытаных раней (Г. Далідовіч «Страта», К. Чорны «Насцечка»), паразважайце, што іх аб'ядноўвае, чаму да іх так ставяцца аднакласнікі. Калі б Вы сустрэліся з Эмай Пшанічнай, Міцем Бокуцем, Насцяй Закрэўскай, што вы параілі б ім?

**У. Караткевіч «Зямля пад белымі крыламі» (7 клас).** Скласці крыжаванку «Прадметы хатняга ўжытку беларусаў» паводле часткі «Просім у хату, госцейкі нашы!» або «Беларуская нацыянальная кухня», або «Хлеб і да хлеба». Зрабіць малюнак да твора ці эмблему «Зямля пад белымі крыламі».

**В. Быкаў «Жураўліны крык» (8 клас).** Сканструяваць свае пытанні да аўтара, да любога героя на лістах. Каму з герояў і за што вы паставілі б помнік, як ён выглядаў бы? Некаторыя вучні ствараюць свае творчыя праекты.